НАЦЫЯНАЛЬНАЯ АКАДЭМІЯ НАВУК БЕЛАРУСІ
ДЗЯРЖАЎНАЯ НАВУКОВАЯ ЎСТАНОВА
“ІНСТЫТУТ ГІСТОРЫІ”

УДК 061.23: 364.054 (476–15) (091) “1921/1939”

Пашковіч
Алена Іосіфаўна

# ДЗЕЙНАСЦЬ ДАБРАЧЫННЫХ АРГАНІЗАЦЫЙ НА ТЭРЫТОРЫІ ЗАХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ Ў 1921–1939 ГГ.

АЎТАРЭФЕРАТ
дысертацыі на суісканне вучонай ступені
кандыдата гістарычных навук
па спецыяльнасці 07.00.02 – айчынная гісторыя

Мінск, 2008

Работа выканана ў Беларускім дзяржаўным універсітэце

Навуковыя кіраўнікі: **Міхнюк Уладзімір Мікалаевіч**,
доктар гістарычных навук, прафесар,
**Зялінскі Пётр Іосіфавіч**,
доктар гістарычных навук, прафесар, Беларускі дзяржаўны універсітэт, кафедра гісторыі Беларусі новага і навейшага часу

Афіцыйныя апаненты: **Тугай Уладзімір Васільевіч**,
доктар гістарычных навук, прафесар, загадчык кафедры гісторыі старажытных цывілізацый і сярэдневякоўя Установы адукацыі "Беларускі дзяржаўны педагагічны універсітэт імя Максіма Танка"
**Цітовіч Ігар Уладзіміравіч**,
кандыдат гістарычных навук, дырэктар нарматыўна-метадычнага цэнтра вышэйшай школы Дзяржаўнай установы адукацыі "Рэспубліканскі інстытут вышэйшай школы"

Апаніруючая арганізацыя – **Установа адукацыі "Гродзенскі дзяржаўны універсітэт імя Янкі Купалы"**

Абарона адбудзецца "26" лютага 2008 г. у 14.00 на пасяджэнні савета Д 01.40.01 па абароне дысертацый на суісканне вучонай ступені доктара гістарычных навук пры Дзяржаўнай навуковай установе "Інстытут гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі" 220072, Мінск, вул. Акадэмічная, 1; e-mail – marat@history.minsk.by, тэлефон вучонага сакратара: 8-017-284-18-69.

З дысертацыяй можна азнаёміцца ў Цэнтральнай навуковай бібліятэцы імя Якуба Коласа Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі (вул. Сурганава, 15).

Аўтарэферат разасланы "25" студзеня 2008 г.

Вучоны сакратар
савета па абароне дысертацый Жылінскі М.Г.

## УВОДЗІНЫ

Дабрачынная дзейнасць на Беларусі мае даўнія традыцыі. Спрадвеку яна была не проста бескарыслівым аказаннем дапамогі абяздоленым, не толькі спосабам пераадолення сацыяльных праблем, але і паказчыкам узроўню духоўнасці і сацыяльных працэсаў, якія адбываюцца ў грамадстве, праявай грамадзянскай і нацыянальнай салідарнасці насельніцтва. У 1921–1939-я гг. на тэрыторыі Заходняй Беларусі дзейнічалі шматлікія свецкія і рэлігійныя дабрачынныя таварыствы, грамадзянскія камітэты, замежныя дабрачынныя арганізацыі. Усе яны ўтваралі асобную сферу грамадскага жыцця заходнебеларускага насельніцтва ў даследуемы перыяд, якая засталася па-за ўвагай даследчыкаў. Гістарычная навука яшчэ не падала дакладнай інфармацыі аб колькасці дабрачынных арганізацый, накірунках і формах іх дзейнасці не толькі на заходнебеларускіх тэрыторыях, але і ў Польшчы ў цэлым. Гэты факт, а таксама шматгранная роля, якую выконвае дабрачыннасць у грамадстве, вызначаюць актуальнасць правядзення даследавання пастаўленай праблемы, якое паслужыць новым падыходам у вывучэнні гісторыі Заходняй Беларусі ў 20–30-я гг. ХХ ст., дапаможа асвятліць яшчэ невядомыя і малавывучаныя моманты грамадскага развіцця рэгіёна, дазволіць удакладніць высновы адносна палітыкі польскіх улад на далучаных заходнебеларускіх тэрыторыях, пашырыць веды аб матэрыяльным становішчы насельніцтва, увядзе ў навуковы ўжытак цэлы пласт раней невядомых дакументальных крыніц. Праблема дабрачыннасці з’яўляецца вельмі актуальнай у сучасным грамадстве. Вывучэнне гістарычнага вопыту дабрачыннай дзейнасці як сродку захавання культурна-нацыянальных традыцый можа быць карысным для этнічных і рэлігійных аб’яднанняў у іх працы з грамадскасцю, дапаможа ў распрацоўцы новых, больш эфектыўных падыходаў у аказанні сацыяльнай дапамогі насельніцтву.

## АГУЛЬНАЯ ХАРАКТАРЫСТЫКА ПРАЦЫ

**Сувязь працы з буйнымі навуковымі праграмамі**. Дысертацыя выканана на кафедры гісторыі Беларусі новага і навейшага часу Беларускага дзяржаўнага універсітэта ў рамках ДКПНД “Гісторыя беларускай нацыі, дзяржаўнасці і культуры” (“Гісторыя і культура”) (загад БДУ ад 23.03.2006 г. № НДР-82), НДР “Успаміны, дзённікі і прыватная перапіска як гістарычная крыніца па гісторыі Беларусі XIX–XX стагоддзяў” (дзяржаўны рэгістрацыйны нумар 20061339) на 2006–2010 гг. Тэма дысертацыі была зацверджана на Савеце гістарычнага факультэта БДУ 24 лютага 2004 г. (пратакол № 4).

**Мэты і задачы даследавання**. Мэта даследавання – на падставе аналізу дакументальных крыніц і навуковай літаратуры ўсебакова асвятліць дзейнасць найбольш значных дабрачынных арганізацый на тэрыторыі Заходняй Беларусі ў 1921–1939 гг. і акрэсліць іх ролю ў жыцці грамадства.

Дасягненне мэты даследавання патрабавала вырашэння наступных задач:

– прааналізаваць заканадаўчую базу дзейнасці дабрачынных арганізацый і характар іх узаемаадносін з дзяржаўнымі ўладамі ў Польшчы ў 1921–1939 гг.;

– асвятліць накірункі, формы, агульныя рысы і асаблівасці дзейнасці нацыянальных дабрачынных арганізацый;

– вызначыць змест дабрачыннай дзейнасці каталіцкіх і праваслаўных арганізацый;

– акрэсліць формы і значэнне дзейнасці замежных дабрачынных арганізацый.

***Аб'ектам даследавання*** з'яўляюцца нацыянальныя, хрысціянскія і замежныя дабрачынныя арганізацыі, а таксама грамадскія арганізацыі, адным з напрамкаў дзейнасці якіх была дабрачыннасць на тэрыторыі Заходняй Беларусі ў 1921–1939 гг.

**Палажэнні, якія выносяцца на абарону:**

1. Дабрачынныя арганізацыі з'яўляліся важным элементам сістэмы сацыяльнай дапамогі насельніцтву ў Польшчы ў 1920–1930-я гг. Іх дзейнасць падрабязна рэгламентавалася шэрагам нарматыўна-прававых дакументаў, кантралявалася з боку дзяржаўных улад і была забяспечана міжнароднымі дагаворамі. Утварэнне дабрачынных арганізацый у Польшчы мела выразны нацыянальны і канфесійны характар.

2. Дзейнасць беларускіх дабрачынных арганізацый была абмежавана як недахопам фінансавых сродкаў, так і палітыкай польскіх улад, накіраванай супраць беларускага нацыянальнага руху, прадстаўнікі якога прымалі актыўны ўдзел у жыцці беларускіх дабрачынных арганізацый. Дзейнасць апошніх праяўлялася перш за ўсё ў падтрымцы беларускіх навучальных і апякунскіх устаноў, правядзенні культурна-асветніцкай працы і тым самым садзейнічала фарміраванню нацыянальнай самасвядомасці.

Дабрачыннасць з'яўлялася абавязковым накірункам дзейнасці шматлікіх польскіх грамадскіх арганізацый, якія, як правіла, аказвалі дапамогу грамадзянам Польшчы, нягледзячы на веравызнанне і нацыянальнасць, падтрымліваліся польскімі ўладамі і прымалі ўдзел у распаўсюджванні сярод насельніцтва Заходняй Беларусі польскай нацыянальнай і дзяржаўнай ідэі.

Яўрэйскія дабрачынныя арганізацыі, якія дзейнічалі на тэрыторыі Заходняй Беларусі, падзяляліся на дзве групы: традыцыйныя таварыствы, дзейнасць якіх абапіралася на рэлігійнае вучэнне і насіла вузкарэгіянальны характар (дзейнічалі пры яўрэйскіх абшчынах), і аддзелы буйных свецкіх

яўрэйскіх дабрачынных арганізацый, якія ўтваралі агульнапольскую арганізацыйную структуру. Агульным для ўсіх яўрэйскіх дабрачынных арганізацый быў канструктыўны характар дапамогі, накіраванай не толькі на забеспячэнне жыццёва неабходных сродкаў, але і падтрымку вытворчай дзейнасці дробных яўрэйскіх прадпрымальнікаў.

Рускія дабрачынныя арганізацыі, як і ўсё рускае насельніцтва Польшчы, падзяляліся на эміgranцкія і меншасныя. Дзейнасць першых асабліва выразна праявілася ў першай палове 1920-х гг., калі была накіравана на аказанне матэрыяльнай і прававой дапамогі бежанцам, інтэрніраваным салдатам расійскай арміі, эмігрантам. Прыярытэтным накірункам дабрачыннасці меншасных арганізацый была падтрымка рускіх навучальных устаноў і культурна-асветніцкая дзейнасць.

Літоўскія дабрачынныя арганізацыі, акрамя аказання дапамогі літоўскаму насельніцтву, актыўна займаліся распаўсюджваннем літоўскай нацыянальнай ідэі, атрымлівалі значныя фінансавыя сродкі ад літоўскага ўрада ў Коўне і літоўскай эміграцыі. Дзейнасць літоўскіх дабрачынных арганізацый польскім урадам расцэньвалася як антыдзяржаўная, што з’явілася галоўнай прычынай іх закрыцця ў канцы 1930-х гг.

3. Дабрачынныя арганізацыі хрысціянскіх канфесій саступалі па маштабах дзейнасці свецкім дабрачынным арганізацыям. Шырока разгалінаванай была дабрачынная дзейнасць каталіцкіх арганізацый. Аднак на тэрыторыі Заходняй Беларусі, асабліва на Палессі, іх дзейнасць не набыла такога развіцця, як у цэнтральных і заходніх ваяводствах. Праваслаўная дабрачыннасць мела менш развітую арганізацыйную структуру і праводзілася пераважна ў традыцыйных формах – зборах ахвяраванняў у храмах сярод вернікаў. Галоўная роля ў арганізацыі і правядзенні дабрачыннай дзейнасці належала свяшчэннаслужыцелям, а не прыхаджанам.

4. Дзейнасць большасці замежных арганізацый была накіравана на аказанне неадкладнай дапамогі пацярпелым ад вайны і не была разлічана на працяглы перыяд. Пасля ліквідацыі найбольш цяжкіх наступстваў ваеннага часу большасць замежных арганізацый згарнула сваю дзейнасць. Адным з фактараў, які абумовіў правядзенне замежнымі арганізацыямі шырокай акцыі дапамогі, было пераадольванне вынікаў крызіснай сацыяльна-эканамічнай сітуацыі ў Польшчы, якая расцэньвалася ў якасці санітарнага кардона на шляху пранікнення рэвалюцыйных ідэй з савецкіх рэспублік. Дабрачыннасць замежных пратэстанцкіх араганізацый суправаджалася рэлігійна-місіянерскай дзейнасцю.

**Асабісты ўклад суіскальніка.** Дысертацыя з’яўляецца самастойным даследаваннем, у працэсе якога быў выяўлены, сістэматызаваны і прааналізаваны раней невядомы фактычны матэрыял па праблеме, якая да гэтага часу не з’яўлялася асобным прадметам вывучэння. У працы

суіскальнікам зроблены высновы аб накірунках, формах, асаблівасцях і значэнні дзейнасці нацыянальных, канфесійных і замежных дабрачынных арганізацый. У выніку даследавання ўпершыню ў навуковы ўжытак былі ўведзены дакументы архіваў Беларусі, Польшчы і Літвы, прааналізаваны навуковыя працы айчынных і замежных даследчыкаў, у якіх закранаюцца пытанні, сумежныя з тэмай дысертацыі.

**Апрабацыя вынікаў дысертацыі.** Дысертацыя абмяркоўвалася на пасяджэннях кафедры гісторыі Беларусі новага і навейшага часу і на навукова-метадалагічным семінары па экспертызе дысертацый гістарычнага факультэта Беларускага дзяржаўнага універсітэта. Вынікі дысертацыйнага даследавання былі прадстаўлены на міжнародных і рэспубліканскіх навуковых канферэнцыях: 1. V Рэспубліканская навуковая канферэнцыя студэнтаў, магістрантаў і аспірантаў Рэспублікі Беларусь (НДРС–2000), (25–27 красавіка 2000 г., Гродна); 2. Міжнародная навукова-практычная студэнцкая канферэнцыя “Беларусь і Польшча ў XX стагоддзі: агульнае і адметнае ў гістарычных лёсах” (7–8 красавіка 2000 г., Брэст); 3. Міжнародная канферэнцыя па праблемах іудаікі (30 студзеня–1 лютага 2001 г., Масква); 4. Міжнародная навукова-практычная канферэнцыя студэнтаў і аспірантаў “Славянскі свет: міжэтнічныя адносіны на парозе трэцяга тысячагоддзя” (16–17 лістапада 2001 г., Брэст); 5. Міжнародная навуковая канферэнцыя студэнтаў і аспірантаў “Трансфармацыя культуры і грамадства беларускага Палесся: мінулае, сучаснасць і перспектывы” (15–16 сакавіка 2002 г., Брэст); 6. IV міжвузаўская навукова-метадычная канферэнцыя маладых навукоўцаў (15–17 мая 2002 г., Брэст); 7. Міжнародная навуковая гістарычная канферэнцыя “Społeczności na pograniczach” (24–26 мая 2002 г., Беласток); 8. Міжнародная навуковая канферэнцыя “Repatriacje i migracje ludności pogranicza w XX wieku. Stan badań oraz źródła do dziejów pogranicza polsko-litewsko-białoruskiego” (25–26 кастрычніка 2003 г., Беласток); 9. Міжнародная навукова-практычная канферэнцыя “Конфессии в Беларуси: история и современность” (7–8 кастрычніка 2004 г., Брэст); 10. Міжнародная навуковая канферэнцыя “Cerkiew a państwo na pograniczu polsko-litewsko-białoruskim. Źródła i stan badań” (25–26 лістапада 2004 г., Беласток); 11. II Міжнародная навуковая канферэнцыя “Polska i kraje sąsiadskie w dobie globalizacji i integracji europiejskiej” (23–24 кастрычніка 2006 г., Супрасль); 12. Міжнародная навуковая канферэнцыя “Rola oświaty i szkolnictwa w procesie kształtowania się świadomości narodowej na pograniczu polsko-litewsko-białoruskim” (16–17 лістапада 2006 г., Беласток); 13. Рэспубліканская навукова-практычная канферэнцыя студэнтаў, аспірантаў і маладых вучоных, прысвечаная 15-годдзю гістарычнага фаультэта БрДУ імя А.С. Пушкіна “Открывая прошлое: историческая наука в начале XXI века” (15 снежня 2006 г., Брэст).

**Апублікаванасць вынікаў дысертацыі.** Вынікі праведзенага даследавання знайшлі адлюстраванне ў 19 публікацыях, сярод якіх 7 – у зборніках матэрыялаў канферэнцый, 12 – у зборніках навуковых прац і часопісах, з якіх 3 уваходзяць у спіс вызначаных ВАК РБ для публікацыі навуковых вынікаў па доктарскіх і кандыдацкіх дысертацыях. Аб'ём апублікаванага матэрыялу – 6,6 аўтарскага аркуша.

**Структура і аб'ём дысертацыі.** Дысертацыя складаецца са спіса ўмоўных скарачэнняў, уводзін, агульнай характарыстыкі працы, чатырох глаў, заключэння, спіса выкарыстаных крыніц (410 найменняў) і дадаткаў. Агульны аб'ём дысертацыі – 158 старонак, з іх бібліяграфія – 30 старонак, дадаткі – 21 старонка.

## АСНОЎНЫ ЗМЕСТ ПРАЦЫ

У **першай главе "Гістарыяграфія праблемы, крыніцы і метады даследавання"** праводзіцца аналіз навуковай літаратуры, апублікаваных дакументальных крыніц і архіўных матэрыялаў, выкарыстаных пры напісанні дысертацыі, апісваюцца метады даследавання.

У айчыннай *гістарыяграфіі* гісторыі Заходняй Беларусі можна выдзеліць некалькі перыядаў. З 1917 г. да сярэдзіны 1950-х гг. у даследаваннях сацыяльна-эканамічнага і грамадска-палітычнага развіцця Заходняй Беларусі рабіўся акцэнт на цяжкім стане насельніцтва краю і неабходнасці яго вызвалення з-пад польскага прыгнёту. Даследуемая тэма ў іх не закранalася.

У другой палове 1950-х–1980-я гг. быў падрыхтаваны шэраг манаграфій, у якіх на шырокім дакументальным матэрыяле паказана барацьба заходнебеларускага насельніцтва за сацыяльнае і нацыянальнае вызваленне, асвятляюцца розныя аспекты эканамічнага развіцця Заходняй Беларусі. Асаблівая ўвага адводзілася гісторыка-партыйнай тэматыцы. Дзейнасць дабрачынных арганізацый у навуковых даследаваннях гэтага перыяду не знайшла свайго адлюстравання. Адзінай грамадскай арганізацыяй, роля якой у аказанні дапамогі насельніцтву Заходняй Беларусі высока ацэньвалася і шырока асвятлялася ў айчыннай гістарыяграфіі, быў МОПР. Спецыяльная ўвага дзейнасці гэтай арганізацыі нададзена ў працах У.А. Палуяна, У.Ф. Ладысева, Т.А. Лугачовай[1]. У працы Я. Мараша дзейнасць арганізацыі "Каталіцкае дзеянне" характарызуецца рэзка адмоўна, з пазіцый камуністычнай і

[1] Гойдь, Т.А. Руководство КПЗБ деятельностью МОПРа в Западной Белоруссии по оказанию материальной помощи политзаключённым и их семьям / Т.А. Гойдь // Весн. Беларус. дзярж. ун-та. Сер. 3, Гісторыя. Філасофія. Навуковы камунізм. Эканоміка. Права. – 1981. – № 2. – С. 13–15; Ладысеў, У.Ф. КПЗБ – арганізатар барацьбы працоўных за дэмакратычныя правы і свабоды (1934–1938 гг.) / У.Ф. Ладысеў. – Мінск: Выдавецтва БДУ імя У.І. Леніна, 1976. – 168 с.; Лугачова, Т.А. Дзейнасць МОПРа па аказанню дапамогі рэвалюцыянерам Заходняй Беларусі / Т.А. Лугачова // Вес. Нац. акад. навук Беларусі. Сер. грамад. навук. – 1988. – № 4. – С. 54–61; Полуян, В.А. Революционно-демократическое движение в Западной Белоруссии (1927–1939 гг.) / В.А. Полуян. – Минск: Наука и техника, 1978. – 360 с.

атэістычнай ідэалогіі. Дабрачыннасць арганізацыі ў працы не асветлена[2]. Роля міжнародных дабрачынных арганізацый у савецкай гістарыяграфіі замоўчвалася ці скажалася, іх дзейнасці надавалася адмоўная ацэнка[3].

З канца 1980-х гг. пачаўся новы этап у развіцці гістарыяграфіі гісторыі Заходняй Беларусі. За апошняе дваццацігоддзе з'явілася вялікая колькасць навуковых прац, якія могуць быць крыніцай інфармацыі па розных праблемах гістарычнага развіцця заходнебеларускага краю ў 1920–1930-я гг[4]. У другой палове 1990-х гг. беларускія навукоўцы пачалі праводзіць спецыяльныя даследаванні, прысвечаныя гісторыі сацыяльнай працы і дабрачыннай дзейнасці ў Беларусі. А.Д. Грыгор'еў упершыню, абапіраючыся на працы расійскіх даследчыкаў, прапанаваў аўтарскую перыядызацыю сацыяльнай працы ў Беларусі. Аднак неасветленай засталася дзейнасць дабрачынных арганізацый і сістэмы сацыяльнага забеспячэння на тэрыторыі Заходняй Беларусі[5]. Дабрачынным установам на тэрыторыі Беларусі ў канцы XIX–пачатку XX стст. прысвечаны даследаванні С.Ф. Шымуковіча[6]. Пытанні прававога становішча, культурнага і грамадска-палітычнага жыцця рускай нацыянальнай меншасці ў ІІ Рэчы Паспалітай з'яўляюцца прадметам даследавання В. Швайко[7]. Дзейнасці рускіх грамадскіх арганізацый і Праваслаўнай царквы на тэрыторыі Заходняй Беларусі прысвечаны працы В.Н. Чарапіцы[8]. Зразумець гістарычныя карані і традыцыі яўрэйскай дабрачыннасці дапамагаюць даследаванні Ю. Функ[9]. Артыкулы па праблеме дабрачыннай дзейнасці ў Заходняй Беларусі зрэдку можна знайсці ў кнігах гісторыка-дакументальнай хронікі "Памяць"[10]. На сённяшні дзень адбываецца

---

[2] Мараш, Я.Н. Политика Ватикана и католической церкви в Западной Белоруссии (1918–1939) / Я.Н. Мараш. – Мінск: Беларусь, 1983. – С. 46.

[3] "АРА" // БСЭ. – 2-е изд. – М., 1950. – Т. 2. – С. 582; "АРА" // Советская историческая энциклопедия: в 12 т. – М., 1961. – Т. 1. – С. 666.

[4] Вабішчэвіч, А. Асвета ў Заходняй Беларусі (1921–1939 гг.) / А. Вабішчэвіч. – Брэст: БрДУ, 2004. – 116 с.; Коўкель, І.І. Аб паходжанні тэрміна "Заходняя Беларусь", яе тэрыторыі, нацыянальным і канфесійным складзе насельніцтва (1921–1939 гг.) / І.І. Коўкель // Этносоциальные и конфессиональные процессы в современном обществе: материалы междунар. науч. конф., Гродно, 16–18 ноября 1999 г. / Гродн. гос. ун-т; редкол.: У.Д. Розенфельда (отв. ред.) [и др.]. – Гродно, 2000. – С. 407–415; Ладысеў, У.Ф. Паміж Усходам і Захадам: станаўленне дзяржаўнасці і тэрытарыяльнай цэласнасці Беларусі (1917–1939 гг.) / У.Ф. Ладысеў, П.І. Брыгадзін. – Мінск: БДУ, 2003. – 307 с.; Міхнюк, У. Заходняя Беларусь: граніцы, тэрыторыя і насельніцтва (гістарыяграфічныя нататкі) / У. Міхнюк // Беларус. гіст. часоп. – 2004. – № 11. – С. 14–21; Загідулін, А.М. Нацыянальная і канфесійная палітыка польскіх улад у адносінах да беларускага насельніцтва Заходняй Беларусі (1921–1939 гг.): дыс. … канд. гіст. навук: 07.00.02 / А.М. Загідулін. – Гродна, 2005. – 130 л.; Цітовіч, І. Краязнаўчы рух на тэрыторыі Заходняй Беларусі ў 1921–1939 гг.: дыс. … канд. гіст. навук: 07.00.02 / І. Цітовіч. – Мінск, 2006. – 175 л. і інш.

[5] Григорьев, А.Д. История отечественной социальной работы с 1917 г. по настоящее время: учеб. пособие / А.Д. Григорьев. – Минск: БГПУ, 2004. – 160 с.; Григорьев, А.Д. История социальной работы: учеб. пособие: в 2 ч. / А.Д. Григорьев. – Минск: ТетраСистемс, 2006. – Ч. 1 (до нач. XX в.). – 464 с. і інш.

[6] Шимукович, С.Ф. Деятельность благотворительных учреждений по социальной защите населения Беларуси (90-е гг. XIX в. – июль 1914 г.): дис. … канд. ист. наук: 07.00.02 / С.Ф. Шимукович. – Минск, 2000. – 193 л.

[7] Швайко, В.Г. Деятельность русских организаций в Польше по сохранению русской культуры в 1921–1939 гг.: дис. ... канд. ист. наук: 24.00.01. / В. Г. Швайко. – Гродно, 2005. – 140 л.

[8] Черепица, В.Н. Очерки истории Православной Церкви на Гродненщине (с древнейших времён до наших дней): в 2 ч. / В.Н. Черепица. – Гродно: ГрГУ, 2005. – Ч. 2. – 440 с. і інш.

[9] Функ, Ю.В. Еврейская благотворительность в Беларуси в XIX – начале XX в. и источники её исследования: дис. ... канд. ист. наук: 07.00.09 / Ю.В. Функ. – Минск, 1999. – 168 л.

[10] Чудзін, Ю. Беларускае таварыства дабрачыннасці ў Стоўбцах (1931–1933) / Ю. Чудзін // Памяць: Стаўб. р-н: гіст.-дак. хронікі гарадоў і р-наў Беларусі / рэдкал.: Г.П. Пашкоў (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск, 2004. – С. 226–228.

рэабілітацыя замежных дабрачынных арганізацый, якія дзейнічалі на тэрыторыі Беларусі пасля Першай сусветнай і польска-савецкай войнаў. Гэтай мэце паслужыла праца Э. Іофе і Б. Мельцэра, у якой на падставе архіўных дакументаў раскрываюцца асноўныя вехі дзейнасці “Джойнта” ў Савецкай Беларусі ў 20-я гг. XX ст.[11] Каштоўную інфармацыю аб фінансавых і харчовых сродках, выдаткаваных Амерыканскай адміністрацыяй дапамогі (ARA) ў Заходняй Беларусі, утрымлівае кніга А. Лукашука[12].

У польскай гістарыяграфіі таксама адсутнічаюць комплексныя даследаванні дзейнасці дабрачынных арганізацый як на тэрыторыі ўсходніх ваяводстваў, так і ўвогуле ІІ Рэчы Паспалітай. Карысную інфармацыю па тэме дысертацыйнага даследавання можна знайсці ў працах, прысвечаных становішчу нацыянальных меншасцяў у Польшчы ў 1918–1939 гг. Найбольш значнымі сярод іх з’яўляюцца даследаванні А. Хайноўскага, Е. Тамашэўскага, Г. Халупчака, Т. Браварыка[13]. Дзейнасці грамадскіх гаспадарчых і культурна-асветніцкіх арганізацый нацыянальных меншасцяў у Польшчы прысвячаецца праца даследчыка Р. Дамброўскага[14]. Найбольш поўным навуковым даследаваннем прававога і сацыяльна-эканамічнага становішча літоўскай нацыянальнай меншасці ў ІІ Рэчы Паспалітай з’яўляецца манаграфія Б. Макоўскага[15]. Сацыяльна-эканамічная сітуацыя ў Польшчы, у тым ліку на заходнебеларускіх тэрыторыях, адлюстравана ў даследаваннях Е. Жарноўскага, М. Лечыка, З. Ландау, Е. Тамашэўскага[16]. У 1980–1990-я гг. у Польшчы выйшаў шэраг прац па гісторыі Каталіцкага касцёла[17]. Становішчу Праваслаўнай царквы ў Польшчы ў 1920–1930-я гг. прысвечана манаграфія М. Папежынскай-Турэк[18]. Даследчык С. Баровяк, праводзячы аналіз працэсу распаўсюджвання метадызму ў міжваенны час, падкрэслівае значную ролю ў аказанні дапамогі насельніцтву Амерыканскай місіі метадыстаў[19]. Вядучымі даследчыкамі гісторыі сацыяльнай працы ў

[11] Иоффе, Э. Джойнт в Беларуси / Э.Г. Иоффе, Б.А. Мельцер. – Мінск: Magic Book, 1999. – 93 с.
[12] Лукашук, А. Прыгоды АРА на Беларусі. / А. Лукашук. – [б. м.]: Радыё Свабодная Эўропа / Радыё Свабода, 2005. – 500 с.
[13] Tomaszewski, J. Ojczyzna nie tylko Polakow. Mniejszości narodowe w Polsce w latach 1918–1939 / J. Tomaszewski. – Warszawa: MAW, 1985. – 224 s.; Chalupczak, H. Mniejszości narodowe w Polsce: 1918–1995 / H. Chalupczak, T. Browarek. – Lublin: Wydaw. UMCS, 1998. – 323 s.; Chojnowski, A. Koncepcje polityki narodowościowej rządów polskich w latach 1921–1939 / A. Chojnowski. – Warszawa: Wydaw. PAN, 1979. – 262 s.
[14] Dąbrowski, R. Działalnośc społeczno-gospodarcza i kulturalna mniejszości narodowych w II Rzeczypospolitej (1918–1939) / R. Dąbrowski. – Szczecin: Wydaw. Uniwersytetu Szczecińskiego, 1990. – 278 s.
[15] Makowski, B. Litwini w Polsce 1920–1939 / B. Makowski. – Warszawa: PWN, 1986. – 352 s.
[16] Landau, Z. Robotnicy przemyslowi w Polsce: materialne warunki bytu 1918–1939 / Z. Landau, J. Tomaszewski. – Warszawa: Książka i wiedza, 1971. – 755 s.; Leczyk, M. Oblicze społeczno-polityczne Drugiej Rzeczypospolitej / M. Leczyk. – Warszawa: Książka i wiedza, 1988. – 505 s.; Żarnowski, J. Społeczeństwo II Rzeczypospolitej (1918–1939) / J. Żarnowski. – Warszawa: PWN, 1973. – 434 s.; Tomaszewski, J. Z dziejów Polesia 1921–1939. Zarys stosunków społeczno-ekonomicznych / J. Tomaszewski. – Warszawa: PWN, 1963. – 208 s.
[17] Bender, R. Katolicka myśl i działalność społeczna w Polsce w XIX i XX w. / R. Bender // Z dziejow katolicyzmu społecznego. – T. 1. – Lublin, 1987. – 454 s.; Kumor, B. Historia Kościoła / B. Kumor. – T. 8: Czasy współczesne, 1914–1998. – Lublin: Wydaw. KUL, 2004. – 704 s.; Zdaniewicz, W. Akcja Katolicka w II Rzeczypospolitej / W. Zdaniewicz // Społeczno-kulturalna działalność Kościoła katolickiego w Polsce XIX i XX w. / pod red. R. Renz i M. Meduckiej. – Kielce, 1994. – S. 73–87.
[18] Papierzyńska-Turek, M. Między tradycją a rzeczywistoscią. Państwo wodec prawoslawia / M. Papierzyńska-Turek. – Warszawa: PWN, 1989. – 484 s.
[19] Borowiak, S. Kościół Ewangielicko-Metodyczny w Polsce / S. Borowiak. – Warszawa: ASCOMP, 1999. – 168 s.

Польшчы на сённяшні дзень з’яўляюцца навукоўцы Э. Лесь і Ч. Кэмпскі[20]. У іх навуковых працах разглядаюцца польскія традыцыі сацыяльнай апекі, развіццё сістэмы сацыяльнай дапамогі і роля ў ёй грамадскай ініцыятывы ў Польшчы.

Сярод замежных даследаванняў асаблівую вартасць уяўляе праца Дж. Лерскага. Змешчаны ў кнізе рэдкі дакументальны матэрыял адлюстроўвае выратавальніцкую дзейнасць ARA і асабісты ўдзел у ёй Г. Гувера[21]. У дысертацыі былі ўлічаны вынікі даследаванняў сучасных расійскіх навукоўцаў, якія асвятляюць асноўныя гістарычныя этапы развіцця сацыяльнай дапамогі ў Расіі, а таксама закранаюць тэрміналагічныя праблемы і метадалагічныя падыходы ў даследаванні дабрачыннасці[22].

*Крыніцамі* для напісання дысертацыі паслужылі архіўныя матэрыялы, апублікаваныя дакументы і ўспаміны. Увесь масіў дакументальнага матэрыялу, выкарыстанага падчас напісання дысертацыі, можна сістэматызаваць наступным чынам: 1) нарматыўна-прававыя дакументы: законы, указы, пастановы, інструкцыі польскага ўрада, якія рэгламентавалі сацыяльнае забеспячэнне насельніцтва і дабрачынную дзейнасць грамадскіх арганізацый; 2) матэрыялы цэнтральных статыстычных устаноў Польшчы 1920–1930-х гг.; 3) дакументацыя цэнтральнай і мясцовай адміністрацыі: паведамленні міністэрстваў аб прызначэнні субсідый на сацыяльнае забеспячэнне і канкрэтным дабрачынным арганізацыям і апякунскім установам, справаздачы ваявод і павятовых стараст аб грамадска-палітычнай і культурнай дзейнасці арганізацый, распараджэнні, выдадзеныя грамадскім арганізацыям, дакументы справаводства аддзелаў сацыяльнага забеспячэння (справаздачы, бюджэтныя праекты, спіскі апякунскіх устаноў і дабрачынных арганізацый, пратаколы рэвізій апякунскіх устаноў, статыстычныя матэрыялы аб колькасці грамадзян, якім патрэбна дапамога); 4) дакументацыя дабрачынных арганізацый і ўстаноў: справаздачы аб дзейнасці, пратаколы пасяджэнняў, статуты, перапіска з цэнтральнымі бюро, мясцовай і цэнтральнай дзяржаўнай адміністрацыяй, спісы членаў арганізацый, плакаты, лістоўкі, адозвы да грамадскасці; 5) пісьмы-прашэнні грамадзян у мясцовыя органы кіравання і кіраўніцтву арганізацый аб аказанні дапамогі.

Частка дакументальнага матэрыялу па тэме дысертацыі знаходзіцца ў апублікаваным стане: у зборніках заканадаўчых актаў, якія выдаваліся польскім урадам у 1920–1930-я гг., справаздачах дабрачынных арганізацый, выданнях Галоўнага статыстычнага ўпраўлення Польшчы. Багаты фактычны матэрыял па тэме дысертацыі можна знайсці на старонках афіцыйнага друку і перыядычных

---

[20] Kępski, Cz. Dziecko sieroce i opieka nad nim w Polsce w okresie międzywojennym / Cz. Kempski. – Lublin: UMCS, 1991. – 230 s.; Leś, E. Zarys historii dobroczynności i filantropii w Polcse / E. Leś. – Warszawa: Prószyński i S-ka SA, 2001. – 153 s.

[21] Lerski, G.J. Herbert Hoover and Poland. A Documentary Histori of a Frendship / G.J. Lerski. – Standford: Hoover Institution Press, 1977. – 128 p.

[22] Ульянова, Г.Н. Благотворительность в Российской империи, XIX – начало XX века / Г.Н. Ульянова. – М.: Наука, 2005. – 403 с.; Фирсов, М.В. История социальной работы в России: учеб. пособие / М.В. Фирсов. – Москва: ВЛАДОС, 2001. – 256 с.

выданняў, якія выходзілі ў даследуемы перыяд. Гістарычная рэчаіснасць міжваеннага часу Заходняй Беларусі адлюстравана ва ўспамінах[23].

Асноўнай крыніцай пры напісанні працы паслужылі архіўныя дакументы. Падчас даследавання былі выкарыстаны дакументы Дзяржаўнага архіва Брэсцкай вобласці, Дзяржаўнага архіва Гродзенскай вобласці, Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь, Нацыянальнага архіва-музея літаратуры і мастацтва, Літоўскага цэнтральнага дзяржаўнага архіва, Архіва новых актаў у Варшаве. Усяго пры напісанні дысертацыі былі выкарыстаны дакументы 145 архіўных спраў, змешчаных у 22 архіўных фондах.

Нераспрацаванасць тэмы дысертацыі і адначасова значная база дакументальных крыніц даюць шырокае поле для правядзення комплекснага аналізу асноўных накірункаў і форм дзейнасці дабрачынных арганізацый у Заходняй Беларусі ў 1921–1939 гг., што з’явілася ***прадметам дысертацыйнага даследавання***.

*Тэарэтычна-метадалагічную базу* даследавання склалі прынцыпы гістарызму і аб’ектыўнасці. Прынцып гістарызму дазволіў разгледзець дзейнасць дабрачынных арганізацый у кантэксце канкрэтна-гістарычнай сітуацыі, у якой адбывалася палітычнае і сацыяльнае развіццё заходнебеларускага грамадства ў 1921–1939 гг. Прынцып аб’ектыўнасці даў магчымасць на падставе шырокага спектра дакументальных крыніц і навуковай літаратуры атрымаць найбольш верагодныя і доказныя веды аб дзейнасці дабрачынных арганізацый у Заходняй Беларусі.

У даследаванні былі выкарыстаны комплекс агульнанавуковых метадаў (аналіз, сінтэз, тыпалагізацыя, класіфікацыя) і метады гістарычнага даследавання (гісторыка-генетычны, гісторыка-тыпалагічны, гісторыка-параўнальны, гісторыка-сістэмны). Гісторыка-генетычны метад дазволіў разгледзець дзейнасць дабрачынных арганізацый у іх генезісе і развіцці, з улікам сацыяльна-эканамічных і палітычных падстаў іх заснавання, далейшай эвалюцыі прынцыпаў і форм аказання дапамогі насельніцтву і прычын іх ліквідацыі. Важнае значэнне пры правядзенні класіфікацыі разнастайных дабрачынных арганізацый мелі гісторыка-параўнальны і гісторыка-тыпалагічны метады. Гісторыка-сістэмны метад дазволіў прааналізаваць феномен дабрачыннасці як арганізаваную сістэму інстытутаў, практычных і этычных прынцыпаў дапамогі чалавеку.

У **другой главе “Нарматыўна-прававая база дзейнасці дабрачынных арганізацый у Польшчы”** аналізуюцца ўсе асноўныя прававыя дакументы, паказана спецыфіка сістэмы сацыяльнай дапамогі насельніцтву і ролі дабрачынных арганізацый як састаўнога элемента гэтай сістэмы. Пастановы

[23] Багдановіч, Я. На жыццёвым шляху: успаміны / Я. Багдановіч. – Мінск: Мастацкая літаратура, 1992. – 144 с.; Вашчукувна-Каменецка, Д. Брест – город незабываемый / Д. Вашчукувна-Каменецка. – Брест: Изд-во С. Лаврова, 2000. – 284 с.; Монтвилов, М. В. Русская гимназия в Бресте на Буге, 1919–1939 / М.В. Монтвилов. – Нім–Брест-Мінск: [б. и.], 1996. – 119 с.; Чэмер, А. Наваградская беларуская гімназія / А. Чэмер. – Вільнюс: [б. в.], 1997. – 133 с.

Малога Версальскага трактата ад 28 чэрвеня 1919 г. і Рыжскага мірнага дагавора ад 18 сакавіка 1921 г. абавязвалі польскі ўрад забяспечваць права нацыянальных меншасцяў на правядзенне дабрачыннай дзейнасці грамадскіх арганізацый. Гэтае права гарантавалася Канстытуцыяй Польшчы ад 17 сакавіка 1921 г. Доўгі час дзейнасць дабрачынных арганізацый на тэрыторыі Заходняй Беларусі рэгулявалася Распараджэннем Генеральнага камісара Усходніх зямель аб таварыствах і саюзах ад 25 верасня 1919 г., якое было заменена толькі ў 1932 г. Законам аб таварыствах. Важнымі для дабрачынных арганізацый былі таксама Закон аб сацыяльным забеспячэнні ад 16 жніўня 1923 г., Распараджэнне Прэзідэнта Польшчы аб наглядзе і кантролі за дзейнасцю ўстаноў сацыяльнай апекі ад 22 красавіка 1927 г., Закон аб публічных зборах ад 15 сакавіка 1933 г. У выніку заканатворчага працэсу адбылася передача паўнамоцтваў па пытаннях нагляду за дзейнасцю дабрачынных арганізацый мясцовай адміністрацыі, а таксама падрабязная рэгламентацыя ўсіх накірункаў дзейнасці дабрачынных таварыстваў з боку дзяржавы. Выключэннем былі каталіцкія дабрачынныя таварыствы і ўстановы, якія карысталіся пашыранымі правамі і пэўнай аўтаноміяй. Асабліваму кантролю з боку дзяржаўнай адміністрацыі і органаў бяспекі падвяргаліся нацыянальныя дабрачынныя арганізацыі, якія садзейнічалі ўзмацненню нацыянальнай самасвядомасці, а таксама арганізацыі, якія знаходзіліся пад камуністычным уплывам. Па выніках праведзенага даследавання, на працягу міжваеннага дваццаціговддзя на тэрыторыі Заходняй Беларусі дзейнічала не менш за 60 свецкіх дабрачынных таварыстваў і грамадскіх арганізацый, якія займаліся дабрачыннай дзейнасцю (без уліку іх рэгіянальных аддзелаў), а таксама 6 каталіцкіх арганізацый, 93 каталіцкія ордэны, 10 праваслаўных таварыстваў, у тым ліку 7 праваслаўных брацтваў. Акрамя іх, дзейнічала не менш за 14 замежных арганізацый. З улікам рэгіянальных аддзелаў колькасць арганізацый, якія займаліся дабрачыннай дзейнасцю на тэрыторыі Заходняй Беларусі ў 1921–1939 гг., па падліках аўтара складала больш за 5 000.

У **трэцяй главе “Дзейнасць нацыянальных дабрачынных арганізацый”** разглядаюцца асноўныя накірункі і формы дзейнасці беларускіх, польскіх, яўрэйскіх, рускіх і літоўскіх дабрачынных арганізацый.

У **раздзеле 3.1** ***“Беларускія дабрачынныя арганізацыі”*** адзначаецца, што грамадская ініцыятыва па аказанню дапамогі чалавеку актыўна праявілася яшчэ падчас Першай сусветнай вайны. Менавіта тады было заснавана Таварыства дапамогі пацярпелым ад вайны ў Вільні, якое пазней стала называцца Беларускім дабрачынным таварыствам. Адметнай старонкай беларускага грамадскага жыцця была дзейнасць Беларускага таварыства дабрачыннасці ў Стоўбцах, Апякунскага камітэта ў Гродне. У пачатку 1920-х гг. на Гродзеншчыне і ў Вільні дзейнічалі прадстаўніцтвы Беларускага таварыства Чырвонага

Крыжа, цэнтральнае бюро якога знаходзілася ў Коўне. У лютым 1929 г. па ініцыятыве Беларускага сялянска-работніцкага пасольскага клуба ў Варшаве было створана Таварыства дапамогі насельніцтву беларускіх зямель, закранутых бедствам неўраджаю. Польскія ўлады актыўна супрацьдзейнічалі распаўсюджванню сярод насельніцтва агітацыі таварыства, не дапускалі стварэння мясцовых камітэтаў дапамогі галадаючым, а таксама розных ініцыятыў самадапамогі сярод насельніцтва Заходняй Беларусі.

У **раздзеле 3.2** ***“Дабрачынная дзейнасць польскіх грамадскіх арганізацый”*** адзначаецца, што ў пачатку 1920-х гг. галоўнай задачай польскіх грамадскіх арганізацый было пераадоленне наступстваў ваеннага часу і фізічнае выратаванне людзей. Аказанне дапамогі дзецям-бежанцам і рэпатрыянтам з’яўлялася мэтай дзейнасці такіх польскіх арганізацый, як Віленскае таварыства апекі над дзецьмі і Камітэт “Хлеб для галодных дзяцей”. У першыя пасляваенныя гады і на працягу ўсяго міжваеннага дваццацігоддзя значную ролю ў аказанні дапамогі насельніцтву выконваў Польскі Чырвоны Крыж. Дзейнасць шэрага польскіх грамадскіх арганізацый была накіравана на аказанне дапамогі моладзі (Камітэты дапамогі польскай студэнцкай моладзі, Таварыства апекі над працоўнай моладдзю і інш.). Дабрачыннасць была важным накірункам дзейнасці польскіх апякунска-асветніцкіх і жаночых грамадскіх арганізацый (Таварыства Польскай Маці Школьнай, Саюз жанчын грамадзянскай працы і інш.).

У **раздзеле 3.3** ***“Яўрэйскія дабрачынныя арганізацыі”*** падкрэсліваецца глыбокая традыцыйнасць яўрэйскай дабрачыннасці, якая падрабязна рэгламентавалася зводам талмудысцкіх законаў і праводзілася ў рамках арганізацыйных структур: яўрэйскіх рэлігійных абшчын, рэлігійных таварыстваў, грамадскіх дабрачынных арганізацый. Да традыцыйных яўрэйскіх дабрачынных арганізацый, якія дзейнічалі на тэрыторыі Заходняй Беларусі, як правіла, пры яўрэйскіх абшчынах, можна аднесці наступныя: „Chesed-Szel-Emet(s)”, „Chewra Kadisza”, „Moszan(r) Zkenim”, “Linas-Hacedek” і інш. Найбольш распаўсюджанай формай яўрэйскай дабрачыннасці было прадастаўленне грашовых пазык дробным рамеснікам і купцам. У міжваеннай Польшчы такія паслугі выконвалі беспрацэнтныя крэдытныя касы “Gemilus Chesed”. Шырокай дабрачыннай дзейнасцю займаліся свецкія яўрэйскія грамадскія арганізацыі: Таварыства аховы здароўя яўрэйскага насельніцтва ў Польшчы (TOZ), Саюз таварыстваў апекі над яўрэйскімі сіротамі “CENTOS”.

У **раздзеле 3.4** ***“Рускія дабрачынныя арганізацыі”*** праводзіцца іх класіфікацыя на эмігранцкія і меншасныя. Аказанне прававой, матэрыяльнай і культурна-асветніцкай дапамогі бежанцам з Расіі, а таксама інтэрніраваным ваеннаслужачым расійскай арміі, якія знаходзіліся ў лагерах на тэрыторыі Польшчы, было галоўнай задачай Рускага папячыцельскага камітэта (РПК).

РПК займаўся таксама асветніцкай і выхаваўчай працай сярод дзяцей і моладзі. Фінансавую падтрымку і юрыдычную дапамогу рускім эмігрантам аказваў Рускі грамадскі камітэт (РК), які з'яўляўся прадстаўнічым органам рускай эміграцыі перад польскімі ўладамі і найбольш уплывовай рускай эмігранцкай грамадскай арганізацыяй у Польшчы. Найбольш значнай дабрачыннай арганізацыяй рускай нацыянальнай меншасці ў Польшчы з'яўлялася Рускае дабрачыннае таварыства (РДТ). У 1920 г. было заснавана Віленскае рускае таварыства, у склад якога ўваходзілі як прадстаўнікі рускай нацыянальнай меншасці, так і рускія эмігранты, што адрознівала таварыства сярод іншых рускіх грамадскіх арганізацый. Таварыства аказвала падтрымку Віленскай рускай гімназіі, заснавала шэраг сацыяльных і культурна-асветніцкіх устаноў.

У **раздзеле 3.5** ***"Літоўскія дабрачынныя арганізацыі"*** асвятляецца дзейнасць найбольш значнай літоўскай грамадскай арганізацыі ў міжваеннай Польшчы – Часовага камітэта віленскіх літоўцаў. Кіраўніцтва камітэта займалася размеркаваннем паміж літоўскімі арганізацыямі значных грашовых сродкаў, у тым ліку тых, што прыходзілі з-за мяжы. Аказанне дапамогі матэрыяльна не забяспечаным колам літоўскага насельніцтва, заснаванне прытулкаў, школ і інтэрнатаў, адкрыццё пунктаў дапамогі ў правінцыі, падтрымка сялян, якія пацярпелі падчас вайны і стыхійных бедстваў, – усё гэта ўваходзіла ў задачы Літоўскага таварыства дабрачыннасці. Адной з найбольш уплывовых літоўскіх культурна-асветніцкіх арганізацый у сельскай мясцовасці было Літоўскае таварыства выхавання моладзі і апекі над ёй імя св. Казіміра. З сярэдзіны 1930-х гг. усё больш выразна выказваліся прэтэнзіі да літоўскіх дабрачынных арганізацый, якія, на думку польскіх адміністрацыйных улад, пад выглядам аказання дапамогі займаліся шпіёнскай дзейнасцю на карысць літоўскага ўрада, што паслужыла галоўнай прычынай забароны іх дзейнасці.

У **чацвёртай главе "Дабрачынная дзейнасць хрысціянскіх канфесій і замежных дабрачынных арганізацый"** разглядаецца дзейнасць каталіцкіх і праваслаўных дабрачынных арганізацый, а таксама замежных яўрэйскіх, амерыканскіх арганізацый і пратэстанцкіх гуманітарных місій, Міжнароднай арганізацыі дапамогі барацьбітам рэвалюцыі (МОПР).

У **раздзеле 4.1** ***"Каталіцкія дабрачынныя арганізацыі"*** асвятляецца каталіцкая дабрачыннасць, якая ў II Рэчы Паспалітай праводзілася свецкімі каталіцкімі таварыствамі, каталіцкімі ордэнамі, пры каталіцкіх парафіяльных касцёлах, праз удзел у дабрачынных акцыях, арганізаваных адміністрацыйнымі ўладамі і грамадскімі нерэлігійнымі арганізацыямі. Дыяцэзіяльныя Саюзы дабрачынных арганізацый „Caritas" з'яўляліся каардынацыйнай і кіруючай структурай усіх каталіцкіх дабрачынных таварыстваў і ўстаноў, якія дзейнічалі на тэрыторыі дыяцэзіі. Адной з найбольш значных каталіцкіх дабрачынных арганізацый у Польшчы было Таварыства св. Вінцэнта. Існавалі жаночыя і

мужчынскія таварыствы св. Вінцэнта – арганізацыі свецкіх асоб, якія актыўна прапаведавалі прынцыпы каталіцкага веравучэння і займаліся дабрачыннасцю.

У **раздзеле 4.2** ***“Дабрачынныя арганізацыі Праваслаўнай царквы”*** разглядаецца дзейнасць Філантрапійнага таварыства дапамогі дзецям і бедным праваслаўнага веравызнання ў Вільні, якое з’яўлялася адной з нешматлікіх праваслаўных свецкіх арганізацый. Галоўнымі накірункамі яго дзейнасці былі: утрыманне дзіцячага прытулка і прытулка для састарэлых, пошук працы, індывідуальная дапамога. Найчасцей дабрачыннасць праваслаўнага насельніцтва праяўлялася ў традыцыйных формах – зборах ахвяраванняў падчас набажэнстваў. У кожным прыходзе рэгулярна праводзіліся скарбоначныя і талерачныя зборы ахвяраванняў на будаўніцтва ці рамонт цэркваў, дзеля чаго ствараліся спецыяльныя камітэты. Дабрачыннай дзейнасцю займаліся праваслаўныя брацтвы. Праваслаўнае мітрапалітальнае дабрачыннае таварыства, якое дзейнічала з 1924 г. у Варшаве пад кіраўніцтвам мітрапаліта Дзіянісія, з’яўлялася цэнтрам праваслаўнай дабрачыннасці ў Польшчы.

У **раздзеле 4.3** ***“Замежныя дабрачынныя арганізацыі”*** асвятляецца дзейнасць такіх амерыканскіх арганізацый, як Амерыканская адміністрацыя дапамогі, Польска-амерыканскі камітэт дапамогі дзецям, Амерыканскі Чырвоны Крыж. Адной з першых міжнародных арганізацый, якія прыйшлі з дапамогай яўрэйскаму насельніцтву заходнебеларускіх тэрыторый, з’яўляўся Амерыканскі аб’яднаны яўрэйскі камітэт па размеркаванню фондаў “Джойнт”, які з вясны 1922 г. распачаў аказанне планамернай дапамогі ў адбудове гаспадаркі пацярпелых раёнаў. Ён заснаваў і фінансаваў у Польшчы шэраг установаў апекі, грамадскіх і гаспадарчых арганізацый. На тэрыторыі Польшчы, у тым ліку Заходняй Беларусі, дзейнічала Федэрацыя яўрэйскіх арганізацый дапамогі, Таварыства падтрымкі прафесійнай і сельскагаспадарчай працы сярод яўрэяў (ОРТ). Падтрымка яўрэйскай каланізацыі і сельскіх гаспадарак з’яўлялася задачай Яўрэйскага каланізацыйнага таварыства. На тэрыторыі Заходняй Беларусі праводзілі актыўную дзейнасць замежныя пратэстанцкія арганізацыі: Амерыканская місія метадыстаў дапамогі Польшчы, Брытанска-амерыканская ратаўнічая камісія, Таварыства сяброў (квакеры). З другой паловы 1920-х гг. яны ажыццяўлялі актыўную рэлігійную дзейнасць, што паслужыла прычынай яе спынення на тэрыторыі Польшчы. Нелегальную дзейнасць па аказанню дапамогі рэвалюцыянерам і іх сем’ям, а таксама прапаганду ідэй камунізму і рэвалюцыйна-вызваленчай барацьбы праводзіў МОПР Заходняй Беларусі. Патранаты над палітвязнямі Заходняй Беларусі дзейнічалі ў Францыі, Канадзе, Аргенціне, ЗША і іншых краінах. У сваёй дзейнасці МОПР Заходняй Беларусі карыстаўся пастаяннай падтрымкай МОПРа БССР і МОПРа СССР.

## ЗАКЛЮЧЭННЕ

**Асноўныя навуковыя вынікі дысертацыі**

1. Шматлікасць і актыўнасць дабрачынных арганізацый, якія былі заснаваны падчас Першай сусветнай вайны і працягвалі дзейнічаць пасля яе заканчэння, выклікалі неабходнасць распрацоўкі польскім урадам заканадаўчай базы, а таксама сістэмы кіравання і кантролю за іх дзейнасцю. Гэты працэс адбываўся на працягу ўсяго перыяду ў кантэксце сацыяльнай, нацыянальнай, замежнай палітыкі польскага ўрада і характарызаваўся тэндэнцыяй да перадачы з цягам часу правамоцтваў мясцовым органам кіравання і падрабязнай рэгламентацыяй усіх накірункаў дзейнасці таварыстваў з боку дзяржавы. Гарантам іх дзейнасці ў ІІ Рэчы Паспалітай паслужылі абавязацельствы, якія ўскладаў на сябе польскі ўрад перад міжнароднай супольнасцю па забеспячэнню правоў нацыянальных меншасцяў у выніку падпісання міжнародных пагадненняў. Грамадскія арганізацыі сталі важным элементам сістэмы аказання дапамогі насельніцтву. У сітуацыі фінансавага дэфіцыту польская дзяржава не магла ўзяць на сябе ўвесь цяжар сацыяльнага забеспячэння насельніцтва і вымушана была шырока выкарыстоўваць дабрачыннасць грамадскасці. Асабліва значную ролю грамадская ініцыятыва выконвала ў апецы над дзецьмі. Большасць апякунска-выхаваўчых устаноў належалі грамадскім арганізацыям. Згодна з заканадаўствам і міжнароднымі абавязацельствамі, польскі ўрад фінансаваў дзейнасць грамадскіх устаноў апекі і павінен быў аказваць фінансавую падтрымку дабрачыннай дзейнасці нацыянальных меншасцяў.

У Заходняй Беларусі яскрава праяўляўся этнаканфесійны характар дабрачыннасці, развіццё якой залежала ў значнай ступені ад рэалізацыі канцэпцыі нацыянальнай і дзяржаўнай асіміляцыі мясцовага насельніцтва. 1923–1937 гг. з’яўляюцца перыядам найбольш актыўнай дзейнасці нацыянальных дабрачынных арганізацый [2, 8, 12].

2. Беларуская дабрачыннасць была прадстаўлена адзінкавымі, не звязанымі паміж сабою грамадскімі арганізацыямі. Дзейнасць беларускіх дабрачынных таварыстваў развівалася галоўным чынам у Вільні, а таксама пры беларускіх гімназіях і насіла лакальны характар. Галоўнымі накірункамі дзейнасці беларускіх дабрачынных таварыстваў з’ўлялася апякунска-выхаваўчая і культурна-асветніцкая дзейнасць, якая суправаджалася распаўсюджваннем беларускай нацыянальнай ідэі. У склад арганізацый уваходзілі прадстаўнікі беларускага нацыянальна-вызваленчага руху. Фінансавая абмежаванасць і пільны кантроль з боку дзяржаўнай адміністрацыі не дазвалялі беларускім дабрачынным арганізацыям пашыраць сферу сваёй дзейнасці, праводзіць акцыі дапамогі

шырокім колам насельніцтва. Аднак яны садзейнічалі фарміраванню нацыянальнай самасвядомасці сярод беларускай грамадскасці [3].

Дабрачынная дзейнасць была адной з функцый шматлікіх польскіх грамадскіх арганізацый у Заходняй Беларусі. Яны прымалі актыўны ўдзел у аказанні безадкладнай дапамогі насельніцтву, пацярпеламу падчас вайны, нягледзячы на нацыянальнасць і веравызнанне. На працягу ўсяго часу свайго існавання польскія грамадскія арганізацыі выконвалі значную ролю ў вырашэнні праблемы дзіцячай беспрытульнасці, утрымліваючы вялікую колькасць апякунскіх устаноў. Не меншае значэнне належала польскім арганізацыям у справе асветы насельніцтва і ліквідацыі непісьменнасці, а таксама ў грамадска-палітычным і патрыятычным выхаванні дзяцей і моладзі. Дзейнасць польскіх грамадскіх арганізацый па ўсіх накірунках праходзіла згодна з афіцыйнай палітыкай польскіх улад і спрыяла паланізацыі заходнебеларускага насельніцтва. Будучы эфектыўным сродкам не толькі вырашэння сацыяльных праблем, але таксама фарміравання ў грамадстве лаяльнасці да дзяржаўных уладаў, польскія арганізацыі атрымлівалі рэгулярныя дзяржаўныя субсідыі і адміністрацыйную падтрымку, што значна пашырала іх магчымасці ў параўнанні з іншымі нацыянальнымі арганізацыямі [1, 8, 11, 15, 17, 18].

Рускія дабрачынныя арганізацыі ў Польшчы падзяляліся на меншасныя і эміграцкія. Галоўнай задачай аддзелаў Рускага дабрачыннага таварыства была дапамога рускім навучальным установам. РДТ асноўную ўвагу адводзіла культурна-асветніцкай дзейнасці, якая выражалася ў правядзенні дабрачынных канцэртаў, вечарын і іншых культурных мерапрыемстваў. Віленскае рускае таварыства, акрамя падтрымкі рускай асветы і культуры, займалася аказаннем матэрыяльнай дапамогі незабяспечаным жыхарам рускай нацыянальнасці. Галоўнай задачай на першым этапе дзейнасці рускіх эміграцкіх арганізацый (РПК, РК) была матэрыяльная і прававая дапамога рускім бежанцам, эмігрантам, інтэрніраваным ваеннаслужачым расійскай арміі. З цягам часу больш увагі надавалася культурна-асветніцкай і выхаваўчай працы. Прадстаўнікі рускіх дабрачынных арганізацый з’яўляліся, як правіла, актыўнымі грамадска-палітычнымі дзеячамі, што выклікала насцярожанасць і пільны нагляд з боку дзяржаўнай улады. Фінансавую падтрымку аказвала з-за мяжы руская эміграцыя, аднак гэтая дапамога не была рэгулярнай [8, 15].

Найбольш разгалінаванай і сістэматызаванай з’яўлялася яўрэйская дабрачыннасць. Традыцыйна ёю займаліся яўрэйскія рэлігійныя абшчыны і таварыствы, задача якіх адпавядала аднаму з рэлігійных наказаў у сферы дабрачыннасці. Найбольш распаўсюджанымі былі касы беспрацэнтнага крэдыту. Аднак у 1920–30-я гг. традыцыйныя яўрэйскія арганізацыі саступілі вядучую ролю ў аказанні дапамогі насельніцтву свецкім арганізацыям, дзейнасць якіх не была звязана з рэлігійным вучэннем і мела агульнапольскую

арганізацыйную структуру (TOZ і „CENTOS”). Яўрэйская дабрачыннасць мела канструктыўны характар і праяўлялася не толькі ў раздачы жыццёва неабходных сродкаў абяздоленым, але і прадастаўляла ім магчымасць выйсці са складанай жыццёвай сітуацыі і распачаць прадпрымальніцкую дзейнасць. Дзейнасць яўрэйскіх дабрачынных арганізацый была магчыма дзякуючы падтрымцы міжнароднай яўрэйскай супольнасці, перш за ўсё “Джойнта”, які выконваў ролю каардынацыйнага і фінансавага цэнтра [5, 14].

Дабрачыннасць літоўскіх арганізацый у Польшчы ў 1920–1930-я гг. была абумоўлена польска-літоўскім міждзяржаўным канфліктам. Сканцэнтраваныя ў Вільні літоўскія арганізацыі каардынаваліся і фінансаваліся літоўскім урадам. Апрача выканання галоўных сацыяльна-апякунскіх задач, літоўскія дабрачынныя таварыствы праводзілі актыўную дзейнасць па распаўсюджванню нацыянальнай ідэі сярод літоўскага насельніцтва. Усе літоўскія грамадскія арганізацыі знаходзіліся пад пільным наглядам з боку польскай дзяржаўнай адміністрацыі. Іх дзейнасць ацэньвалася як антыпольская, шпіёнская і нават дыверсійная, у выніку чаго ў канцы 1930-х гг. былі закрыты амаль усе літоўскія грамадскія арганізацыі.

Апрача сацыяльнай функцыі, усе дабрачынныя арганізацыі выконвалі значную грамадзянска-асветніцкую і нацыянальна-выхаваўчую ролю. Іх дзейнасць насіла палітычны характар, так як спрыяла распаўсюджванню нацыянальнай ідэі, фарміраванню нацыянальнай самасвядомасці. Нацыянальныя дабрачынныя арганізацыі былі сапраўднымі культурна-нацыянальнымі цэнтрамі, спрыялі захаванню культурных традыцый, з’яўляліся асноўнымі арганізатарамі свецкага культурнага жыцця насельніцтва.

3. Дзейнасць дабрачынных арганізацый хрысціянскіх канфесій саступала па маштабах свецкай дабрачыннасці. Апякунскія ўстановы праваслаўных і каталіцкіх арганізацый былі невялікімі, знаходзіліся, як правіла, на самазабеспячэнні, вялі ўласную гаспадарку. Пад канец 1930-х гг. была створана шырока разгалінаваная арганізацыйная структура каталіцкай дабрачыннасці, хоць працэс яе цэнтралізацыі не быў поўнасцю завершаны. Большасць каталіцкіх дабрачынных арганізацый з’яўляліся праўрадавымі, іх дзейнасць была накіравана на пашырэнне ўплыву Каталіцкага касцёла і тым самым спрыяла паланізацыі мясцовага насельніцтва. Праваслаўная дабрачыннасць не мела шырока разгалінаванай інстытуцыянальнай структуры і, як правіла, адбывалася традыцыйна ў прыходах у форме збораў ахвяраванняў. Гэта было звязана як з кансерватыўнасцю форм супрацоўніцтва Праваслаўнай царквы з грамадскасцю, абмежаванасцю яе фінансавых мажлівасцяў, так і з палітыкай польскага ўрада, накіраванай на стрымліванне праваслаўнай дабрачыннасці ў якасці формы грамадскай дзейнасці [10, 19].

4. Мэтай замежных дабрачынных арганізацый была ліквідацыя на тэрыторыі Заходняй Беларусі найбольш цяжкіх наступстваў ваеннага часу. Іх дзейнасць была засяроджана на дастаўцы самых неабходных жыццёвых сродкаў, мела выратавальны характар і не была разлічана на працяглы перыяд. Актыўная дзейнасць замежных арганізацый была ў значнай ступені абумоўлена палітычнымі мэтамі – недапушчэннем на ўсходніх тэрыторыях абвастрэння сацыяльнага становішча і падтрымкай маладой польскай дзяржавы, якая разглядалася еўрапейскімі краінамі і ЗША ў якасці бар'ера перад распаўсюджваннем рэвалюцыі з савецкіх тэрыторый. Замежныя дабрачынныя арганізацыі супрацоўнічалі з польскім урадам, які першапачаткова быў зацікаўлены ў іх дзейнасці як сродку аказання пільнай дапамогі абяздоленаму насельніцтву. Аднак з часам, па меры пераадолення пасляваеннай разрухі, польскі ўрад пачаў адмаўляцца ад замежнай дапамогі. Адной з прычын гэтага было нежаданне прысутнасці ў Польшчы арганізацый, якія не поўнасцю падпадалі пад кантроль польскіх улад. У першую чаргу гэта тычылася пратэстанцкіх гуманітарных місій, дабрачынная дзейнасць якіх суправаджалася распаўсюджваннем рэлігійных вучэнняў і заснаваннем рэлігійных абшчын. Да сярэдзіны 1920-х гг. амаль усе замежныя арганізацыі згарнулі сваю непасрэдную дзейнасць на тэрыторыі Заходняй Беларусі і працягвалі аказваць дапамогу праз мясцовыя арганізацыі і ўстановы. МОПР Заходняй Беларусі, акрамя дапамогі рэвалюцыянерам і іх сем'ям, выконваў ідэалагічна-прапагандысцкія задачы, з'яўляўся формай фінансавання савецкім урадам вызваленчага руху на тэрыторыі Польшчы [6, 7].

**Рэкамендацыі па практычнаму выкарыстанню вынікаў**

Вынікі праведзенага даследавання могуць паслужыць падставай для больш глыбокага далейшага вывучэння акрэсленых у ім праблем (спецыяльнага вывучэння асобных дабрачынных арганізацый). Матэрыялы дысертацыі могуць быць карыснымі пры складанні лекцыйных курсаў па гісторыі Беларусі XX ст., распрацоўцы спецкурсаў па асобных пытаннях гісторыі Заходняй Беларусі, а таксама пры выкладанні гісторыі сацыяльнай працы ў Беларусі для студэнтаў сацыялагічных спецыяльнасцяў ВНУ. Фактычны матэрыял дысертацыі можа быць выкарыстаны пры напісанні артыкулаў, падручнікаў, навучальных дапаможнікаў, абагульняльных прац па гісторыі Беларусі. Вынікі даследавання будуць карыснымі ў працэсе распрацоўкі новых форм і метадаў аказання сацыяльнай дапамогі насельніцтву, дзейнасці сучасных дабрачынных арганізацый, якія могуць садзейнічаць вырашэнню сацыяльных праблем, спрыяць гарманізацыі сацыяльных адносін у грамадстве і павышэнню яго духоўнасці.

## СПІС ПУБЛІКАЦЫЙ СУІСКАЛЬНІКА


**Артыкулы ў навуковых часопісах**

1. Пашковіч, А.І. Дабрачынная дзейнасць польскіх грамадскіх арганізацый у сферы выхавання дзяцей і моладзі ў Заходняй Беларусі (1921–1939 гг.) / А.І. Пашковіч // Весн. Брэсц. ун-та. Сер. гуманітар. і грамад. навук. – 2006. – № 2 (26). – С. 54–63.

2. Пашковіч, А.І. Станаўленне заканадаўчай базы дзейнасці дабрачынных арганізацый у II Рэчы Паспалітай (1921–1929 гг.) / А.І. Пашковіч // Весн. Гродзен. ун-та. Сер. 1, Гісторыя. Філасофія. Паліталогія. Сацыялогія. – 2006. – № 4 (45). – С. 37–42.

3. Пашковіч, А. Беларускія дабрачынныя арганізацыі на тэрыторыі Заходняй Беларусі ў 1920–1930-я гады / А. Пашковіч // Беларус. гіст. часоп. – 2007. – № 3. – С. 22–27.

**Артыкулы ў зборніках навуковых прац і перыядычных выданнях**

4. Пашкович, Е.И. Реорганизация детских приютов на территории Полесского воеводства в 1939–1941 гг. / Е.И. Пашкович // Моладзь Берасцейшчыны: зб. студ. навук. прац / Брэсц. дзярж. ун-т; навук. рэд. І.І. Акінчыц. – Брэст, 1999. – С. 110–115.

5. Пашкович, Е.И. Еврейские благотворительные организации на территории Полесского воеводства (1921–1939 гг.) / Е.И. Пашкович // Евреи Беларуси: история и культура: сб. науч. тр. / Союз белорус. евр. обществ. об-ний и общин, Научно-просветительский центр им. С. Дубнова; сост.-ред. И. Герасимова. – Минск, 2001. – Вып. 5. – С. 112–125.

6. Paszkowicz, J. Działalność amerykańskich organizacji charytatywnych w województwie poleskim w początkowym okresie funkcjonowania II Rzeczypospolitej / J. Paszkowicz // Gryfita: Białostocki magazyn historyczny. – 2001. – № 23/24. – S. 53–54.

7. Пашкович, Е.И. Деятельность международных еврейских организаций в восточных регионах II Речи Посполитой в 1921–1939 гг. / Е.И. Пашкович // Sztetł – wspólne dziedzictwo. Szkice z dziejów ludności żydowskiej Europy Środko-Wschodniej / Instytut Historii Uniwersytetu w Białymstoku; red.: A. Markowski, W. Śleszyński. – Białystok, 2003. – S. 55–61.

8. Пашкович, Е.И. Милосердие и взаимопомощь в идеологии и практике различных национальных и религиозных групп Полесского воеводства в 1921–1939 годах / Е.И. Пашкович // Zeszyty naukowe Studenckiego Koła Naukowego historyków Uniwersytetu w Białymstoku / Studenckie Koło Naukowe historyków Uniwersytetu w Białymstoku; pod. red. R. Poniata. – Białystok, 2003. – S. 105–112.

9. Пашкович, Е.И. Обзор документов делопроизводства Отдела социального обеспечения Полесского воеводского управления за 1921–1939 гг. (по материалам Государственного архива Брестской области) / Е.И. Пашкович // Repatriacje i migracje ludności pogranicza w XX wieku. Stan badań oraz źródła do dziejów pogranicza polsko-litewsko-białoruskiego / Instytut Historii Uniwersytetu w Białymstoku, Archiwum Państwowe w Białymstoku; red.: M. Kietliński, W. Śleszyński. – Białystok, 2004. – S. 239–243.

10. Пашкович, Е.И. Благотворительная деятельность Католической Церкви на территории северо-западных воеводств II Речи Посполитой в 1921–1939 годах по материалам архивов Беларуси / Е.И. Пашкович // Cerkiew a państwo na pograniczu polsko-litewsko-białoruskim. Źródła i stan badań / Instytut Historii Uniwersytetu w Białymstoku, Archiwum Państwowe w Białymstoku; red.: M. Kietliński, K. Sychowicz, W. Śleszyński. – Białystok, 2005. – S. 302–311.

11. Пашковіч, А. Удзел польскіх грамадскіх арганізацый у выхаванні і асвеце насельніцтва Заходняй Беларусі (1921–1939 гг.) / А. Пашковіч // Rola oświaty i szkolnictwa w procesie kształtowania się świadomości narodowej na pograniczu polsko-litewsko-białoruskim / Instytut Historii Uniwersytetu w Białymstoku, Archiwum Państwowe w Białymstoku; red.: W. Śleszyński. – Białystok, 2007. – S. 201–209.

12. Пашковіч, А. Формы дапамогі беспрацоўным на заходнебеларускіх тэрыторыях Польшчы ў 1921–1939 гг. / А. Пашковіч // Filozoficzno-kulturowe i prawno-gospodarcze aspekty procesów integracyjnych w Europie Środkowo-Wschodniej: monogr. nauk. / Politechnika Białostocka; pod red. Z. Tomczonek. – Białystok, 2007. – S. 351–359.

**Матэрыялы канферэнцый**

13. Пашкович, Е.И. Детские приюты на территории Полесского воеводства в 1921–1939 годах / Е.И. Пашкович // V Республиканская научная конференция студентов, магистрантов и аспирантов Республики Беларусь (НИРС–2000): материалы конф., Гродно, 25–27 апр. 2000 г.: в 5 ч. / М-во образования Респ. Беларусь, Белорус. координац. центр науч.-исслед. работы студентов, Гродн. гос. ун-т, Гродн. гос. мед. ун-т, Грод. гос. с.-х. ин-т; редкол.: С.А. Маскевич [и др.]. – Гродно, 2000. – Ч.1. – С. 94–96.

14. Пашкович, Е.И. Благотворительность в жизни еврейского населения Полесского воеводства (1921–1939) / Е.И. Пашкович // Еврейское образование и благотворительность: доклады на Восьмой Ежегод. междунар. междисциплин. конф. по иудаике, Москва, 30 янв.–1 февр. 2001 г. / Центр науч. работников и преподавателей иудаики в вузах “Сэфер”; отв. ред. К.Ю. Бурмистров. – М., 2001. – Вып. 5. – С. 13–21.

15. Пашкович, Е.И. Деятельность светских благотворительных организаций на территории Полесского воеводства в 1921–1939 гг. // Беларусь і Польшча ў XX стагоддзі: агульнае і адметнае ў гістарычных лёсах: матэрыялы Міжнарод. студэнцкай навук.-практ. канф., Брэст, 7–8 крас. 2000 г. / М-ва адукацыі Рэсп. Беларусь, Брэсц. дзярж. ун-т, Беластоцкі ун-т; рэдкал.: І.І. Акінчыц [і інш.]. – Брэст, 2001. – С. 206–211.

16. Пашкович, Е.И. Деятельность женских общественных организаций на территории Полесского воеводства в 20–30 годы XX века / Е.И. Пашкович // Славянскі свет. Міжэтнічныя адносіны на мяжы III тысячагоддзя: матэрыялы міжнарод. навук.-практ. канф. студэнтаў і аспірантаў, Брэст, 16–17 лістап. 2001 г. / М-ва адукацыі Рэсп. Беларусь, Брэсц. дзярж. ун-т; рэдакц. рада: І.І. Акінчыц [і інш.]. – Брэст, 2002. – С. 239–244.

17. Пашкович, Е.И. Роль кружков сельских домохозяек в жизни женщин Полесского воеводства (1921–1939 гг.) / Е.И. Пашкович // Трансфармацыя культуры і грамадства беларускага Палесся: мінулае, сучаснасць і перспектывы: матэрыялы Міжнарод. навук. канф. студэнтаў і аспірантаў, Брэст, 15–16 сак. 2002 г. / М-ва адукацыі Рэсп. Беларусь, Брэсц. дзярж. ун-т; рэдакц. рада: А.Ю. Бодак [і інш.]. – Брэст, 2003. – С. 71–74.

18. Пашкович, Е.И. Polska Macierz Szkolna на Полесье / Е.И. Пашкович // IV межвузовская науч.-метод. конф. молодых ученых: сб. материалов, Брест, 15–17 мая 2002 г. / М-во образования Респ. Беларусь, Брест. гос. ун-т; под общ. ред. В.С. Секержицкого. – Брест, 2002. – С. 83–84.

19. Пашкович, Е.И. Благотворительная деятельность Православной Церкви в Польше в 1921–1939 годах (по материалам Полесской епархии / Е.И. Пашкович // Канфесіі на Беларусі: гісторыя і сучаснасць: матэрыялы Міжнарод. навук.-практ. канф., Брэст, 7–8 окт. 2004 г. / Камітэт па справах рэлігіі і нацыянальнасцяў пры Савеце Міністраў Рэсп. Беларусь, Ін-т гісторыі НАН Беларусі, Брэсц. дзярж. ун-т, Каф. культуралогіі; рэдкал.: У.П. Люкевіч [і інш.]. – Брэст, 2005. – С. 203–207.

# РЭЗЮМЭ

**Пашковіч Алена Іосіфаўна**
**Дзейнасць дабрычынных арганізацый**
**на тэрыторыі Заходняй Беларусі ў 1921–1939 гг.**

***Ключавыя словы:*** дабрачынная дзейнасць, дабрачынныя арганізацыі, міласэрнасць, філантропія, сістэма сацыяльнага забеспячэння, сацыяльная дапамога, сацыяльная апека, установы апекі, грамадскія арганізацыі, гуманітарныя місіі, рэлігійныя брацтвы.

***Мэта даследавання:*** на падставе аналізу дакументальных крыніц і навуковай літаратуры ўсебакова асвятліць дзейнасць найбольш значных дабрачынных арганізацый на тэрыторыі Заходняй Беларусі ў 1921–1939 гг., акрэсліць іх ролю ў жыцці грамадства.

***Метады даследавання:*** метадалагічную базу даследавання склалі прынцыпы гістарызму і аб’ектыўнасці. У даследаванні быў выкарыстаны комплекс агульнанавуковых метадаў (аналіз, сінтэз, тыпалагізацыя, класіфікацыя) і метады гістарычнага даследавання (гісторыка-генетычны, гісторыка-тыпалагічны, гісторыка-параўнальны, гісторыка-сістэмны).

***Навуковая навізна і практычная значнасць даследавання:*** зроблена першая ў айчыннай гістарыяграфіі спроба правесці спецыяльнае даследаванне дзейнасці дабрачынных арганізацый на тэрыторыі Заходняй Беларусі ў 1921–1939 гг., у выніку якога была выяўлена роля дабрачынных арганізацый як важнага элемента сацыяльнай дапамогі насельніцтву Заходняй Беларусі і сродку захавання культурна-нацыянальных традыцый, паглыблены навуковыя веды па гісторыі грамадска-культурнага жыцця этнаканфесійных меншасцяў на тэрыторыі Заходняй Беларусі, праведзены ўсебаковы аналіз нарматыўна-прававой базы, што дазволіла вызначыць тэндэнцыі ў развіцці дзяржаўнай палітыкі адносна дабрачынных арганізацый.

Аналітычны і фактычны матэрыял дысертацыі можа быць выкарыстаны пры напісанні абагульняльных даследаванняў па гісторыі Заходняй Беларусі, а таксама ў працэсе распрацоўкі новых форм і метадаў аказання сацыяльнай дапамогі насельніцтву сучаснымі дабрачыннымі арганізацыямі.

# РЕЗЮМЕ


**Пашкович Елена Иосифовна**
**Деятельность благотворительных организаций на территории Западной Беларуси в 1921–1939 гг.**

***Ключевые слова:*** благотворительная деятельность, благотворительные организации, общественные организации, гуманитарные миссии, религиозные братства, милосердие, филантропия, система социального обеспечения, социальная помощь, социальная опека, учреждения опеки.

***Цель исследования:*** на основе анализа документальных источников и научной литературы всесторонне осветить деятельность наиболее значительных благотворительных организаций на территории Западной Беларуси в 1921–1939 гг., определить их роль в жизни общества.

***Методы исследования:*** методологическую базу исследования составили принципы историзма и объективности. В исследовании был использован комплекс общеисторических методов (анализ, синтез, типологизация, классификация) и методы исторического исследования (историко-генетический, историко-типологический, историко-сравнительный, историко-системный).

***Научная новизна и практическая значимость исследования:*** сделана первая в отечественной историографии попытка провести специальное исследование деятельности благотворительных организаций на территории Западной Беларуси в 1921–1939 гг., в результате которого была выявлена роль благотворительных организаций как важного элемента системы социальной помощи населению Западной Беларуси и средства сохранения культурно-национальных традиций, углублены научные знания по истории общественно-культурной жизни национальных меньшинств на территории Западной Беларуси, проведён анализ нормативно-правовой базы, что позволило определить тенденции в политике польских властей по отношению к деятельности благотворительных организаций.

Аналитический и фактический материал диссертации можно применить при написании обобщающих исследований по истории Западной Беларуси, в процессе разработки новых форм и методов оказания социальной помощи населению современными благотворительными организациями.

## Summary

**Pashkovich Alena Iosifauna**
**Activity of Charity Organizations on the Territory of Western Belarus in 1921–1939**

***Key words:*** charity activity, charity organizations, public organizations, humanitarian missions, religions congregations, charity, mercy, system of social security, public assistance, public trusteeship, establishments of trusteeship.

***Object of the research*** is to cover the activity of the most important charity organizations on the territory of Western Belarus in 1921–1939 and to determine there role in the society in need on the basis of documentary sources and scientific literature.

***Methods of research**:* Methodological base of the research is founded on the principles of historical method and objectivity. The complex of universal historical methods (analysis, synthesis, typology, classification) and methods of historical investigation (historical-genetic, historical-typology, historical-comparative, historical-systematic) were used.

***Scientific novelty and practical meaning of the research**:* The first attempt in home historiography was made to carry out a special investigation of the activity of organizations on the territory of Western Belarus in 1921–1939. As a result of the research the role of charity organizations as an important element of public assistance to the population and a means of saving cultural life of ethno confessional minorities on the territory of Western Belarus was extended and all-round analysis of normative-legal base was carried out. All this helped to discover tendencies in the development of state policy as regards charity organizations.

The analytical and factual material of the thesis dissertation can be used while writing resumptive research on the history of Western Belarus. Results of the research can be helpful while working out new forms and methods of rendering public assistance to the population and activity of present charity organizations.